**Форум гістарычных даследаванняў Беларусі**

**аб’яўляе конкурс на атрыманне**

# Стыпендый для навуковых стажыровак

“Форум гістарычных даследаванняў Беларусі” з’яўляецца платформай для прэзентацыі актуальных праблем і прабелаў у даследаванні гісторыі Беларусі, дае прастору для дыскусій і ўмацоўвае грамадскую цікавасць да гэтых пытанняў. Асаблівая ўвага форума скіраваная на заахвочванне маладых навукоўцаў займацца гісторыяй Беларусі і Германіі, у прыватнасці, у транснацыянальным вымярэнні. Для гэтага Форум прапануе стыпендыі для стажыроўкі на адзін месяц.

**Стыпендыя разлічана на 1 месяц.**

**Сума стыпендыі** складае:

- 1.200 € для аспірантаў і навукоўцаў з Беларусі;
- 1.525 € для аспірантаў і навукоўцаў з Германіі;
- 2.000€ для postDocs з абедзьвюх краін.

Не пазней чым праз тры месяцы пасля заканчэння стыпендыі неабходна падаць справаздачу аб выніках стажыроўкі.

**У заяўку ўключаюцца наступныя дакументы:**

- абгрунтаванне тэмы з аглядам стану даследаванасці праблемы, а таксама з указаннем папярэдніх работ аўтара заяўкі па тэме, выкарыстаных методык і крыніц (max. 3 старонкі);
- працоўны план стажыроўкі;
- рэзюмэ / CV;
- спіс публікацый;
- рэкамендацыя ад навуковага кіраўніка/навуковай кіраўніцы або іншай асобы з акадэмічнай прасторы.

**Для кандыдатаў і кандыдатак з Беларусі:** абгрунтаванне тэмы і працоўны план неабходна падаць на беларускай і англійскай або рускай і англійскай мовах. Астатнія дакументы прымаюцца на беларускай або рускай мовах.
**Для кандыдатаў і кандыдатак з Германіі:** абгрунтаванне тэмы і працоўны план неабходна падаць на нямецкай і англійскай мовах. Астатнія дакументы прымаюцца на нямецкай або англійскай мовах.

Заяўкі прымаюцца ў выглядзе аднаго PDF-файла да **22 мая 2022 г.** па электроннай пошце belarus.forum@dgo-online.org

Пры наяўнасці пытанняў звяртайцеся да каардынатаркі Алесі Белановіч-Петц: belanovich-petz@dgo-online.org